# Р А З В А Ж А Н Н І

(Па чарговых днях Навэнны, перад Вяночкам)

**4 кастрычніка 2025 г.**

*Адказныя: айцы кармэліты і сёстры кармэлітанкі*

Заклік: Кроў Хрыста, новага і вечнага Запавету, – выбаў нас.

Інтэнцыя: Молімся за Каталіцкі Касцёл, за духавенства, праз якое здзяйсняюцца сакрамэнты і адбываецца цэлебрацыя Эўхарыстыі, за кансэкраваных асобаў, а таксама аб новых святарскіх і законных пакліканнях.

Святарства неаддзельнае ад сакрамэнту Эўхарыстыі, бо толькі праз святароў Хрыстус можа сілкаваць нас і прабываць сярод людзей у сваіх сакрамэнтальных знаках. Вернікі, якія моляцца за святароў, не толькі дапамагаюць ім выконваць іх няпростую і адказную місію, але, просячы ў Бога новых пакліканняў, дбаюць пра будучыню Касцёла, каб дастаткова было «работнікаў на ніве Божай». У сваіх малітвах мы таксама павінны памятаць пра памерлых святароў з нашых парафій, якія вялі нас да Бога, цэлебруючы сакрамэнты і абвяшчаючы Божае слова, і праз іх заступніцтва прасіць аб пакліканнях да святарскага служэння.

Езус сказаў сястры Фаўстыне (Дз 531): «Я аддаю табе ў апеку дзве каштоўныя для Майго сэрца пярліны — гэта душы святароў і манаскія душы; за іх ты будзеш асабліва маліцца, іх сіла будзе ў вашым знясільванні. Малітвы, пасты, утаймаванні, працу і ўсе цярпенні ты будзеш яднаць з Маімі малітваю, постам, утаймаваннем, працаю, цярпеннем, і тады яны будуць мець сілу перад Маім Айцом».

Пане і Божа наш, Валадар неба і зямлі, дзякуем Табе за дар святарства і Эўхарыстыі, за ўсе святарскія і манаскія пакліканні, за кожную святую Імшу, якая цэлебруецца ў нашых святынях, за абвешчанае святарамі Божае слова і Тваю міласэрнасць, якою Ты нас адорваеш у святых сакрамэнтах.

*Молімся словамі св. Фаўстыны Кавальскай* (Дз 1052): О мой Езу, я прашу Цябе за ўвесь Касцёл, дай яму любоў і святло свайго Духу, дай сілу святарскім словам, каб зацвярдзелыя сэрцы пакаяліся і вярнуліся да Цябе, наш Збаўца. Пане Езу, дай нам святых святароў. Ты сам захавай іх у святасці. О Боскі і Найвышэйшы Святар, няхай моц Тваёй міласэрнасці спадарожнічае ім усюды і бароніць іх ад д’ябальскіх пастак і нератаў, якія пастаянна расстаўляюцца на святарскія душы. О Пане, няхай моц Тваёй міласэрнасці крушыць і ператварае ў пыл усё, што магло б азмрочыць святасць святара, бо Ты ўсё можаш. Амэн.

*Малітва паводле св. Тэрэзы ад Дзіцяткі Езуса:*

О Езу, Вечны Найвышэйшы Святар, вазьмі сваіх святароў пад апеку Твайго Найсвяцейшага Сэрца, дзе ніхто не зможа ім зашкодзіць.

Захавай бездакорнымі іх нам*а*шчаныя далоні, якія штодзённа дакранаюцца да Твайго святога Цела. Захавай чыстымі іх вусны, якія акрапляюцца Тваёю Найдаражэйшаю Крывёю. Захавай чыстымі іх сэрцы, намашчаныя прыгожаю пячаткаю Твайго святарства. Учыні, каб яны ўзрасталі ў любові і вернасці Табе, захоўвай іх ад сапсаванасці і бруду гэтага свету. Разам з моцаю перамены хлеба і віна, удзялі ім таксама моц перамены сэрцаў.

Удзялі ім дух ахвярнасці, каб служэннем, якое выконваюць, яны прыносілі плёны святасці ў іх саміх, а таксама ў тых, да каго Ты іх пасылаеш.

Няхай душы, якім яны служаць, будуць для іх радасцю і суцяшэннем тут, на зямлі, а таксама вечнаю каронаю ў будучым жыцці.

Марыя, Маці Касцёла, Маці Найвышэйшага Святара, узор для ўсіх пакліканняў, дапамажы адказаць «так» Пану, які заклікае нас супрацоўнічаць у Божым плане збаўлення. Амэн.

**Малітва перад Вяночкам**

*Молімся за духавенства, праз якое на чалавецтва сыходзіць Божая Міласэрнасць:*

Езу найміласэрнейшы, ад Цябе сыходзіць усё добрае, памнож у нас ласку, каб мы годна выконвалі ўчынкі міласэрнасці, каб тыя, што на нас глядзяць, праслаўлялі Айца міласэрнасці, які ёсць у небе.

Ойча спрадвечны, глянь вокам міласэрнасці сваёй на супольнасць абраных у вінаградніку сваім, на душы святарскія і манаскія, і адары іх моцаю свайго благаслаўлення, а дзеля пачуццяў Сэрца Сына свайго, у якім душы гэтыя прабываюць, удзялі ім моцы і святла свайго, каб маглі яны весці іншых па дарогах збаўлення, каб разам спявалі хвалу неспасцігальнай міласэрнасці Тваёй на векі вечныя. Амэн.

**8 лістапада 2025** г. (у Будславе – звычайны ружанец)

1 лістапада 2025 г. (у парафіях – Фацімскі ружанец)

*Адказныя: айцы капуцыны і сёстры адаратаркі*

Заклік: *Кроў Хрыста, збаўленне душаў чыстцовых, – выбаў нас.*

Інтэнцыя: Молімся за памерлых святароў і кансэкраваных асобаў, за памерлых з рэлігійных рухаў нашай мітраполіі, а таксама за тых, хто загінуў у выніку праследу за веру, і за душы, церпячыя ў чыстцы.

Наш абавязак — заўсёды памятаць пра тых, хто адышоў у вечнасць — пра святароў, кансэкраваных асобаў, што прысвяцілі сваё жыццё служэнню Богу і людзям, памятаць пра тых, хто сваім жыццём даў прыклад мужнасці веры, хто вытрываў праслед, хто не адмовіўся ад крыжа Хрыста, хто аддаў сваё жыццё за Езуса. Касцёл таксама памятае ўсіх вернікаў, якія жылі ў веры, надзеі і любові, але яшчэ чакаюць уваходу ў вечную радасць і прагнуць нашых малітваў. Няхай наша агульная малітва стане святлом на іх шляху і падтрымкай у ачышчальным чаканні сустрэчы з Айцом. Але не толькі малітвай мы можам дапамагчы душам, церпячым у чыстцы. Можам ахвяраваць за іх свае цярпенні, свой боль, а таксама самую галоўную і дзейсную дапамогу — святую Імшу і адпусты.

Св. Айцу Піо, манаху капуцыну, вялікаму містыку і стыгматыку, была дадзена ласка бачыць і размаўляць з душамі, церпячымі ў чыстцы. Ён марыў, каб чысцец быў пустым, каб як мага хутчэй мы, вернікі, сваімі міласэрнымі ўчынкамі, постам, малітвамі, ахвяраваннем сваіх цярпенняў — і фізічных і духоўных — дапамаглі гэтым душам дасягнуць неба. Ён часта паўтараў: «Мы павінны маліцца за душы ў чыстцы. Цяжка нават уявіць, колькі яны могуць зрабіць для нашага духоўнага дабра з-за удзячнасці да тых, хто памятае іх на зямлі і моліцца за іх. Малітва таго, хто пакутуе і, ахвяруючы гэтыя пакуты, просіць Божых ласкаў для дабра бліжніх, вельмі прыемная Богу; яна дасягае глыбіні Божага Сэрца. Малітва душаў у чыстцы больш эфектыўная ў вачах Бога, таму што яны пакутуюць. Таксама айцец Піо казаў пра тое, што лёс душы вынікае з духоўнага стану ў апошнія хвіліны перад смерцю, нават залежыць ад яго, ад тых апошніх праблескаў веры і скрухі, якія могуць выратаваць душу ад небяспекі духоўнай смерці.

Езус казаў св. сястры Фаўстыне (Дз 811): «У гадзіну смерці Я абараняю кожную душу, як сваю хвалу, калі яна моліцца Вяночак, або калі пры паміраючым яго памоляцца іншыя — яны атрымаюць такі самы адпуст. Калі

пры паміраючым моляцца Вяночак, уціхамірваецца Божы гнеў, неспасцігальная міласэрнасць атуляе душу і ўзварушваюцца глыбіні Божай міласэрнасці дзеля Маёй балеснай мукі. О, калі б усе зразумелі, якая вялікая міласэрнасць Пана, але як жа ўсім нам патрэбная гэтая міласэрнасць, асабліва ў гэтую вырашальную гадзіну адыходу».

*Найдаражэйшая Кроў Пана нашага Езуса Хрыста, пагасі агонь чыстца!*

**Малітва перад Вяночкам**

*Молімся за душы ў чыстцы:*

Езу найміласэрнейшы, Ты сказаў: «Будзьце міласэрнымі, як і Айцец ваш міласэрны» (Лк 6, 36), прымі ў дом Твайго Найлітасцівейшага Сэрца душы, якія пакутуюць у чыстцы.

Ойча спрадвечны, глянь вокам міласэрнасці сваёй на душы, якія пакутуюць у чыстцы, і праз балесную муку Езуса Хрыста і праз горыч, якою было заліта Яго Найсвяцейшае Сэрца, акажы ім міласэрнасць сваю. Просім Цябе, каб глядзеў на іх не інакш, як толькі праз раны Наймілейшага Сына свайго, бо верым, што дабрыня Твая і літасць бязмежныя. Амэн.

**6 снежня 2025 г.**

*Адказныя: ксяндзы марыяне і сёстры эўхарысткі*

Заклік: *Кроў Хрыста, уцелаўлёнага Слова Божага, – выбаў нас.*

Інтэнцыя: Молімся за сем'і нашага краю, каб, дзякуючы аднаўленню ў Хрысце і па прыкладу Святой Сям'і з Назарэту, яны станавіліся сапраўднай святыняй жыцця і любові; каб, развіваючы веру і захоўваючы хрысціянскія традыцыі, нашыя сем'і былі надзейным «хатнім касцёлам», адкрытым на пакліканні да святарскага і кансэкраванага жыцця.

Папа Бэнэдыкт XVI часта падкрэсліваў, што «сям'я — гэта неабходнае дабро для народаў, аснова грамадства, якую немагчыма нічым замяніць, і вялікі скарб для сужэнцаў на працягу ўсяго іх жыцця. (...) Кожны нясе вялікую адказнасць за абвяшчэнне поўнай праўды пра сям'ю, заснаваную на сужэнстве як *хатнім Касцёле* і святыні жыцця. Божы план для сужэнцаў знаходзіць сваю паўнату ў Езусе Хрысце, які ўзвысіў сужэнства да годнасці сакрамэнту. Адорваючы сужэнцаў асабліва Духам Святым, Хрыстус дазваляе ўдзельнічаць у Яго любові, робячы сужэнцаў знакам Яго любові да Касцёла — вернай і поўнай любові. Калі сужэнцы змогуць прыняць гэты дар, штодня з верай аднаўляючы сваё «так» і сілаю, якая паходзіць з ласкі сакрамэнту, то іх сям'я будзе жыць Божай любоўю, на ўзор Святой Сям'і з Назарэту».

Святы Ян Павел II, папа сем'яў, як часта яго называлі, не стамляўся паўтараць: «Сям'я, моцная ў Богу, становіцца сілай чалавека і ўсяго народа... Будзьце носьбітамі хрысціянскай веры і надзеі ў гэтым свеце, жывучы любоўю штодня. Будзьце вернымі сведкамі Уваскрослага Хрыста, ніколі не адступаючы перад перашкодамі, якія ўзнікаюць на вашым жыццёвым шляху, часта прасіце ў малітве дапамогі ў Панны Марыі і святога Юзафа, каб яны навучылі вас прымаць Божую любоў, як яны. Нялёгка, асабліва сёння, жыць сваім пакліканнем, але рэальнасць любові цудоўная; гэта адзіная сіла, якая сапраўды можа перамяніць свет.

Скарб сям'і ў Касцёле належыць (...) усім тым бацькам і маці, сынам і дочкам, якія праз сям'ю адкрылі шлях свайго чалавечага і хрысціянскага пакліканні і якія дасягнулі святасці. Святая Сям'я з'яўляецца пачаткам многіх іншых святых сем'яў.

Я звяртаюся, — гаварыў Папа, — моцай праўды Хрыста да людзей нашага часу, каб яны зразумелі, якім вялікім дабром з'яўляюцца сужэнства, сям'я і жыццё, і якая вялікая небяспека крыецца ў адсутнасці павагі да гэтых

рэалій, у ігнараванні гэтых найвялікшых каштоўнасцяў, з якіх складаецца сямейнае жыццё і якія з'яўляюцца чалавечай годнасцю» *(Jan Paweł II. 2 lutego 1994 roku, w Święto Ofiarowania Pańskiego)*. У кожнай хрысціянскай сям'і мы павінны адкрыць розныя формы і рысы паўсюднага Касцёла, менавіта каталіцкая сям'я павінна стаць прапаведнікам Евангелля для іншых сем'яў і для асяроддзя, у якім яна жыве, прыкладам любові і еднасці. Менавіта праведныя сем'і, верныя Богу і хрысціянскім каштоўнасцям, з'яўляюцца надзеяй будучыні Касцёла і свету. *Святая Сям'я з Назарэта, беражы нашыя сем'і, захоўвай іх ад усяго злога і вядзі бяспечнымі шляхамі да Божага Валадарства*.

**Малітва перад Вяночкам**

*Малітва за сем'і паводле св. Яна Паўла II*

Божа, ад Цябе паходзіць усялякае бацькоўства ў небе і на зямлі. Ойча, які ёсць любоўю і жыццём, учыні, каб кожная чалавечая сям'я на зямлі праз Твайго Сына, Езуса Хрыста, народжанага з Жанчыны, праз Духа Святога станавілася сапраўднаю калыскаю жыцця і любові для новых пакаленняў.

Учыні, каб Твая ласка скіроўвала думкі і ўчынкі сужэнцаў на сапраўдную карысць для іх уласных сем'яў і ўсіх сем'яў на свеце. Учыні, каб маладое пакаленне знаходзіла ў сем'ях моцную падтрымку для сваёй чалавечнасці і яе развіцця ў праўдзе і любові. Учыні, каб любоў, узмоцненая ласкаю сакрамэнту сужэнства, была мацнейшаю за ўсялякія слабасці і крызісы, праз якія часам праходзяць нашыя сем'і.

Нарэшце, учыні — просім Цябе аб гэтым праз пасрэдніцтва Святой Сям'і з Назарэта — каб Касцёл сярод усіх народаў зямлі мог плённа выконваць сваю місію ў сем'ях і праз сем'і. Праз Хрыста, Пана нашага, які ёсць дарогай, праўдай і жыццём на векі вечныя. Амэн.

**3 студзеня 2026 г.**

*Адказныя: айцы францішкане, сёстры місіянеркі Святой Сям'і*

Заклік: *Кроў Хрыста, супакой і радасць сэрцаў нашых, — выбаў нас.*

Інтэнцыя: Молімся аб спакоі ва ўсім свеце, аб міласэрнасці для ўсяго чалавецтва, аб любові да Бога і бліжніх, а таксама аб еднасці хрысціянаў.

«Спакой нараджаецца з новага сэрца»,— зазначаў святы Ян Павел II. У пасланні на чарговы Дзень спакою (1984 г.) Вялікі Папа напісаў: «Мы, хрысціяне, вучні Езуса, занепакоеныя напружаннем нашай эпохі, павінны памятаць, што толькі "міратворцы" могуць знайсці шчасце (пар. Мц 5, 9). (…)

Добрасумленнасць не дазваляе нам пагадзіцца з падзеламі і канфліктамі, якія супрацьпастаўляюць нас адзін аднаму, нават калі мы вызнаем адну і тую ж веру; мы не можам пасіўна згаджацца на працяг канфліктаў, якія разбураюць еднасць чалавецтва, пакліканага стаць адным целам. Ці можам мы, праяўляючы прабачэнне, бясконца змагацца адзін з адным? Ці можам мы заставацца праціўнікамі, заклікаючы таго ж самага жывога Бога? Калі закон любові Хрыста — гэта наш закон, ці будзем мы маўчаць і быць бяздзейнымі перад аблічам зраненага свету, які чакае, што мы станем на пярэднім краі тых, хто будуе спакой? З пакораю і ўсведамляючы сваю ўласную слабасць, давайце падыдзем да Эўхарыстычнага стала, дзе той, хто аддае сваё жыццё за столькіх сваіх братоў і сясцёр, дае нам новае сэрца і ўдыхае ў нас новы дух (пар. Эз 36, 26). З глыбіні нашай убогасці і адчаю мы выказваем сваю ўдзячнасць праз Яго, бо Ён аб'ядноўвае нас сваёй прысутнасцю і дарам Сябе; Ён, які прыйшоў і «абвясціў спакой вам, якія далёка, і спакой тым, якія блізка» (Эф 2, 17). І паколькі нам дадзена прымаць Яго, таму патрэбна, каб мы былі Яго сведкамі праз нашу братэрскую працу ўсюды там, дзе будуецца спакой» *(Z orędzia Jana Pawła II na XVII Światowy Dzień Pokoju, 1984 r.)*

Папа Леў XIV у сваім першым пасланні на Сусветны дзень міру 2026 года заклікае чалавецтва «адмовіцца ад жаданняў гвалту і вайны, каб прыняць сапраўдны спакой, заснаваны на любові і справядлівасці. Спакой павінен быць бяззбройны, гэта значыць заснаваны не на боязі, пагрозах ці ўзбраеннях. Акрамя таго, спакой павінен быць раззбройваючым — быць здольным вырашаць канфлікты, адкрываць сэрцы і абуджаць давер, эмпатыю і надзею. Недастаткова заклікаць да спакою — яго трэба ажыццяўляць у ладзе жыцця, які адкідвае ўсялякія формы насілля, бачныя ці структурныя… Заклік Уваскрослага Хрыста "Спакой вам" (Ян 20, 19) — гэта заклік, скіраваны да ўсіх

— веруючых і няверуючых, палітычных лідараў і грамадзянаў — каб будаваць Валадарства Божае і разам ствараць чалавечую і мірную будучыню» *(З Паслання на Сусветны дзень міру 2026 г.).*

**Малітва перад Вяночкам**

*Малітва святога Яна Паўла ІІ аб спакоі*

О Божа айцоў нашых, вялікі і міласэрны! Пане жыцця і спакою, Ойча ўсіх людзей! Тваёю воляю з’яўляецца спакой, а не мучэнні. Ты паслаў свайго Сына Езуса Хрыста, каб Ён абвяшчаў спакой усім і з'яднаў у адну сям'ю людзей усіх расаў і пакаленняў.

Пачуй крык усіх Тваіх дзяцей, пакутлівую просьбу ўсяго чалавецтва. Няхай ужо больш не будзе войнаў — гэтых ліхіх падзеяў, з якіх няма зваротнага шляху, — няхай ужо больш не будзе войнаў — гэтага клубка барацьбы і гвалту. Учыні, каб спыніліся войны ў свеце, якія пагражаюць Тваім стварэнням у небе, на зямлі і на моры.

З Марыяй, Маці Езуса і нашаю Маці, просім Цябе, абудзі сэрцы тых, хто адказны за лёсы народаў. Знішчы жаданні адплаты і помсты, праз Духа Святога натхні людзей на новыя, велікадушныя і высакародныя рашэнні, заснаваныя на дыялогу і цярплівым чаканні, — больш плённыя, чым гвалтоўныя ваенныя дзеянні. Ойча, адары наш час спакоем. Няхай ужо больш нідзе ў свеце не будзе вайны. Злітуйся над грэшным чалавецтвам, няхай і надалей распасціраецца над намі Твая міласэрнасць і любоў. Амэн.

**7 лютага 2026 г.**

Агульнабеларускі дзень кансэкраванага жыцця

*Адказныя: Аб'яднанне вышэйшых настаяцеляў, дэлегатаў і прадстаўнікоў манаскіх супольнасцяў і інстытутаў кансэкраванага жыцця*

Заклік: *Кроў Хрыста, мужнасць мучанікаў, — выбаў нас.*

Інтэнцыя: Молімся аб пакліканні да святарскага і кансэкраванага жыцця, за тых маладых людзей, якія пачулі ў сваім сэрцы голас паклікання, каб адважна ішлі за Хрыстом, а таксама аб вытрываласці і святасці для ўсіх, хто служыць Хрысту.

Што сталася б са светам, калі б у ім не было законнікаў? — задае пытанне святы Ян Павел II у адгартацыі *Vita consecrata,* якую ён прысвяціў кансэкраванаму жыццю. — Кансэкраванае жыццё мае вялікае значэнне менавіта таму, што яно выяўляе неабмежаваную бескарыслівасць і любоў, а гэта асабліва важна ў свеце, якому пагражае патоп няважных і праміальных рэчаў. У жыцці Касцёла і самога грамадства патрэбны людзі, здольныя цалкам прысвяціць сябе Богу і бліжнім з любові да Бога.

Менавіта з кансэкраванага жыцця нараджаецца новы запал і моц для абвяшчэння Евангелля ўсяму свету, бо патрэбныя людзі, якія будуць паказваць айцоўскае аблічча Бога і мацярынскае аблічча Касцёла, якія змогуць рызыкнуць уласным жыццём, каб іншыя маглі жыць і мець надзею. Касцёлу патрэбныя кансэкраваныя асобы, якія, перш чым пачаць служэнне ў той ці іншай высакароднай справе, дазваляюць Божай ласцы перамяніцца і цалкам прытрымліваюцца запаведзяў Евангелля (*Vita consecrata 105*).

Святы Ян Павел II звяртаўся да моладзі: «Калі пачуеце заклік Хрыста, не адкідайце яго! Адважна ідзіце вялікімі шляхамі святасці, пракладзенымі выдатнымі святымі ўслед за Хрыстом. Будзьце верныя ідэалам, характэрным для вашага ўзросту, але не вагайцеся прыняць план Бога адносна вас, калі Ён пакліча вас шукаць святасці ў кансэкраваным жыцці. Захапляйцеся ўсімі Божымі справамі ў свеце, але ўмейце скіроўваць свой позірк на рэчаіснасць, якая ніколі не праміне. Трэцяе тысячагоддзе чакае ўкладу веры і ініцыятывы мноства маладых кансэкраваных асобаў, каб свет стаў больш радасным месцам, здольным прыняць Бога і ў Ім усіх Яго сыноў і дачок» *(EV 106).*

Святая Марыя дэ Маціяс, заснавальніца супольнасці сясцёр адаратарак Крыві Хрыста, гаварыла: «Бог паклікаў нас да святасці, якая выяўляецца ў

любові да Хрыста, а таксама ў нястомнай працы дзеля збаўлення душаў, адкупленых Найдаражэйшаю Крывёю Хрыста».

**Малітва перад Вяночкам**

*Малітва да Найсвяцейшай Тройцы*

Найсвяцейшая Тройца, напоўні благаслаўленнем сваіх сыноў і дачок, якіх Ты паклікала, каб вызнавалі веліч Тваёй любові, Тваёй міласэрнай дабрыні і Тваёй прыгажосці. Святы Ойча, асвяці сваіх сыноў і дачок, якія прысвяцілі сябе Табе дзеля хвалы Твайго імені. Успамагай іх сваёю моцаю, каб яны маглі сведчыць, што Ты — пачатак усяго, адзіная крыніца любові і свабоды. Дзякуем Табе за дар кансэкраванага жыцця, якое з верай шукае Цябе і, выконваючы сваю ўніверсальную місію, заклікае ўсіх, каб ішлі да Цябе.

Езу, наш Збаўца, уцелаўлёнае Слова, Ты даверыў свой жыццёвы шлях тым, каго паклікаў, прыцягвай да сябе людзей, якія будуць сведкамі Тваёй міласэрнасці для сучасных людзей, прадвесцем Твайго вяртання, жывым знакам будучага ўваскрасення. Няхай ніякае выпрабаванне не адарве іх ад Тваёй любові!

Дух Святы, Любоў, улітая ў сэрцы, Ты даеш ласку і натхненне; адвечная Крыніца жыцця, Ты даводзіш да завяршэння місіі Хрыста праз разнастайныя харызмы, мы просім Цябе за ўсіх кансэкраваных асобаў. Напоўні іх сэрцы глыбокай упэўненасцю ў тым, што яны былі выбраныя, каб любіць, праслаўляць і служыць. Дазволь ім адчуць Тваё сяброўства, напоўні іх Тваёю радасцю і суцяшэннем, дапамагай ім пераадолець хвіліны цяжкасцяў і падымацца пасля падзенняў, учыні іх адлюстраваннем Боскай прыгажосці. Дай ім адвагу супрацьстаяць выклікам нашага часу і ласку паказваць людзям дабрыню і чалавечнасць нашага Збаўцы Езуса Хрыста *(EV 111).*

**7 сакавіка 2026 г.**

*Адказныя: ксяндзы хрыстусоўцы, сёстры назарэтанкі*

Заклік: *Кроў Хрыста, надзея ў пакаянні, — выбаў нас.*

Інтэнцыя: Перапрашэнне за грахі супраць жыцця, і просьба аб захаванні хрысціянскіх традыцый у сям'і.

У сваёй энцыкліцы *Evangelium Vitae* святы Ян Павел II звярнуў увагу на грахі і небяспекі для чалавецтва: забойства ненароджаных дзяцей, эўтаназію, жыццё без захавання Божых запаведзяў, а таксама прапаганду антыевангелізацыі. Вялікі Папа шмат разоў гаварыў таксама пра неабходнасць прабачэння і перапрашэння за гэтыя грахі, пра міласэрнага Бога, які жадае зрабіць кожнага чалавека сапраўды свабодным. Бог заўсёды хоча весці нас па шляху любові і прабачэння. Ён дае нам надзею, Ён хоча аднавіць усё ў Хрысце: нас і ўсё, што нас акружае, а таксама аднавіць светапогляд тых, хто далёкі ад Творцы і хто працягвае распаўсюджваць цывілізацыю смерці. Бог, які пранікае і ведае нашыя сэрцы, заўсёды дае нам час, каб мы вярнуліся да Яго зноў, як блудны сын з найглыбейшых маральных цярпенняў і разгубленасці.

«Запаведзь "Не забівай" змяшчае ў сабе не толькі забарону. Яна заклікае нас да канкрэтных пазітыўных адносінаў і паводзінаў. Не забівай, а беражы жыццё, беражы здароўе і шануй годнасць кожнага чалавека, незалежна ад яго расы ці рэлігіі, узроўню інтэлекту, свядомасці, узросту, стану здароўя ці хваробы. Не забівай, але прымай іншага чалавека як дар Божы, асабліва калі гэта тваё ўласнае дзіця. Не забівай, а імкніся дапамагчы сваім бліжнім, каб яны з радасцю прынялі сваё дзіця, якое, як яны лічаць, з'явілася несвоечасова…

Будуйма ж агульную будучыню нашай Айчыны паводле Божага закону, паводле той адвечнай Мудрасці, якая будзе актуальнай у кожную эпоху, паводле Евангелля Хрыста. А дакладней: аднаўляйма ўсё ў Хрысце, бо шмат што было зруйнавана, зруйнавана ў сэрцах людзей і ў іх сумленнях, у звычаях, у калектыўнай думцы…» (*Jan Paweł II. 4 czerwca 1991 r., Msza św. na lotnisku wojskowym w Radomiu).*

Перапрашаючы за грахі супраць жыцця, памятайма, што кожны вернік павінен абараняць жыццё, павінен быць апосталам цывілізацыі жыцця, дапамагаць, калі не словам і ўчынкамі, то сваёю малітвай, міласцінай і ўдзельнічаючы ў акцыі «Духоўнага ўсынаўлення» ненароджаных дзяцей.

**Малітва перад Вяночкам**

*Малітва перапрашэння за грахі супраць жыцця*

Пане Езу, сёння мы хочам перапрасіць за ўсіх тых, хто мае на сэрцы цяжар грахоў супраць жыцця; як за тых, хто ўжо адышоў у вечнасць, не пакаяўшыся за цяжкія грахі супраць жыцця, так і за тых, хто сёння стаіць на баку цывілізацыі смерці, не ўсведамляючы трагічных наступстваў гэтага граху для сябе і сваіх сем'яў.

Божа, Творца і Даўца жыцця, прымі нашыя малітвы, якія мы ўзносім да Цябе праз заступніцтва Тваёй Святой Маці, Багародзіцы Марыі, чыё Сэрца ўсё яшчэ пранізвае меч балесці з-за злачынстваў, учыненых супраць Цябе і Яе дзяцей.

Езу, Боскі Збаўца, Ты на Крыжы перамог смерць, пекла і сатану, а сваім уваскрасеннем вывеў нас з цемры да святла, вызваліўшы нас з няволі граху, просім Цябе з пакораю: прымі нашу глыбокую скруху і перапрашэнне. З глыбіні нашых сэрцаў мы сёння ўсклікаем да Цябе ад імя ўсіх, каго датычыць гэты грэх, — як у мінулых пакаленнях нашых продкаў, так і нашых сучаснікаў і нас саміх. О Езу, дай прабачэнне і міласэрнасць, праз заслугі Тваіх Святых Ранаў. Ойча Спрадвечны, ахвяруем Табе раны Пана нашага Езуса Хрыста, каб загойваліся раны нашых душаў.

Ойча Спрадвечны, будзь да нас міласэрны праз Кроў Езуса Хрыста, Сына Твайго Адзінага, — просім Цябе, будзь міласэрны да нас і да ўсяго свету!

Святы Божа, Святы Моцны, Святы Несмяротны, змілуйся над намі і над усім светам! Амэн.

**11 красавіка 2026 г.**

(4 красавіка Вялікая субота, таму пераносіцца на 11.04.2025)

*Адказныя: айцы міхаліты, сёстры Маці Божай Міласэрнасці*

Заклік: *Кроў Хрыста, крыніца міласэрнасці, — выбаў нас.*

Інтэнцыя: Перапрашэнне Божай Міласэрнасці і прысвячэнне Мінска-Магілёўскай Мітраполіі Божай Міласэрнасці.

Заўтра адзначаецца свята Божай Міласэрнасці. Гэта асаблівае свята, калі нават самыя вялікія грэшнікі могуць стаць на шлях святасці. Пра гэтую вялікую ласку Пан Езус сказаў святой Фаўстыне: «Дачка Мая, кажы ўсяму свету пра Маю неспасцігальную міласэрнасць. Я прагну, каб свята Міласэрнасці было паратункам і прытулкам для ўсіх душаў, і асабліва для бедных грэшнікаў. У гэты дзень адкрытыя глыбіні Маёй міласэрнасці, Я выліваю цэлае мора ласкаў на душы, якія набліжаюцца да крыніцы Маёй міласэрнасці. Тая душа, якая прыступіць да споведзі і святой Камуніі, атрымае поўнае адпушчэнне правінаў і караў. У гэты дзень адкрытыя ўсе Божыя каналы, па якіх сыходзяць ласкі; няхай не баіцца наблізіцца да Мяне ніводная душа, нават калі б яе грахі былі, як пурпур. Мая міласэрнасць такая вялікая, што на працягу ўсёй вечнасці не спасцігне яе ніякі розум — ані чалавечы, ані анёльскі. Усё, што існуе, выйшла знутры Маёй міласэрнасці. Кожная душа ў адносінах да Мяне будзе цэлую вечнасць разважаць над Маёю любоўю і міласэрнасцю. Свята Міласэрнасці выйшла знутры Мяне… Не зведае чалавецтва спакою, пакуль не звернецца да крыніцы Маёй міласэрнасці» (Дз 699).

Сёння мы павінны перапрашаць Божую Міласэрнасць за наш недавер да Бога, за нашае супраціўленне Ягонаму Провіду і волі, за нашыя сумневы і за ўсё, што нас аддаляе ад Яго. Мы часта забываем, што Пан робіць усё, каб адарыць нас сваім спакоем: праз споведзь, словы блізкага чалавека, унутранае суцяшэнне Святога Духа, або нават праз нейкую нечаканую падзею. Рознымі спосабамі Бог клапоціцца пра тое, каб мы адчулі абдымкі Яго міласэрнасці, адчулі радасць, якая нараджаецца ад атрымання «прабачэння і спакою». Так, Божая радасць — гэта радасць, якая нараджаецца з прабачэння і пакідае спакой, радасць, якая ўздымае наш дух. Калі мы адчуваем радасць вызвалення ад цяжару нашых грахоў, нашых няўдачаў; калі кожны з нас асабіста спазнае, што значыць нарадзіцца зноў пасля досведу, які здаваўся безнадзейным, тады мы павінны дзяліцца хлебам міласэрнасці з бліжнімі. Дзяліцца, каб як мага больш

людзей даверылася Божай Міласэрнасці, каб яны спазналі сапраўдны спакой і радасць, каб знік страх і ў душы кожнага заяснела Божая надзея.

«Душы, якія імкнуцца да дасканаласці, няхай асабліва ўшаноўваюць Маю міласэрнасць, бо шчодрасць ласкаў, якія Я ім удзяляю, струменіць з Маёй міласэрнасці. Я жадаю, каб гэтыя душы вызначаліся бязмежным даверам да Маёй міласэрнасці. Я сам займаюся асвячэннем такіх душаў, Я дам ім усё, што будзе неабходна для іх святасці. Ласкі з Маёй міласэрнасці чэрпаюцца адным начыннем — даверам. Чым больш душа давярае, тым больш атрымлівае. Душы, якія бязмежна давяраюць, для Мяне — вялікая радасць, бо такім душам Я даю ўсе скарбы сваіх ласкаў. Я радуюся, што яны шмат патрабуюць, бо Маё жаданне — шмат даваць, прычым вельмі шмат» (Дз 1578).

**Малітва перад Вяночкам:**

*Молімся за тых, хто асаблівым чынам ушаноўвае і праслаўляе Божую Міласэрнасць:*

Езу найміласэрнейшы, Сэрца Тваё – сама любоў, прымі ў дом Найлітасцівейшага Сэрца свайго душы тых, хто асабліва ўшаноўвае і праслаўляе веліч міласэрнасці Тваёй. Душы гэтыя магутныя сілаю самога Бога; сярод пакутаў і цяжкасцяў яны ідуць наперад, спадзеючыся на міласэрнасць Тваю. Паяднаныя з Табою, о Езу, душы гэтыя нясуць усё чалавецтва на плячах сваіх. Яны не будуць асуджаныя сурова, а міласэрнасць Твая атуліць іх у хвіліну смерці.

Ойча спрадвечны, глянь вокам міласэрнасці сваёй на душы, якія праслаўляюць і ўшаноўваюць невымоўную годнасць Тваю, Тваю неспасцігальную міласэрнасць, якія прабываюць у Найлітасцівейшым Сэрцы Езуса. Душы гэтыя з’яўляюцца жывым Евангеллем, рукі іх поўняцца ўчынкамі міласэрнасці, а сэрцы, перапоўненыя радасцю, будуць спяваць песню міласэрнасці Найвышэйшаму. Прашу Цябе, Божа, акажы ім міласэрнасць сваю паводле надзеі і даверу, якія на Цябе ўскладалі. Няхай споўніцца на іх абяцанне Езуса, які сказаў ім, што душы, якія будуць ушаноўваць гэтую неспасцігальную міласэрнасць Ягоную, сам Ён будзе бараніць у жыцці, а асабліва ў хвіліну смерці, як сваю хвалу. Амэн.

## АКТ ПРЫСВЯЧЭННЯ

### Божай Міласэрнасці Мінска-Магілёўскай мітраполіі, Касцёла і народа Беларусі

Міласэрны Божа, у сваёй вялікай любові да нас Ты стварыў свет, анёлаў і людзей. Праз уцелаўленне Твайго Сына Ты стаў адным з нас, каб праз Пасхальную таямніцу праявіць сваю найбольшую Міласэрнасць і збавіць нас. Ты застаўся з намі ў святых сакрамэнтах, асабліва ў сакрамэнце Эўхарыстыі і пакаяння, у Божым слове і ва ўсёй дзейнасці Касцёла.

Дзякуючы за атрыманыя ласкі, падчас шматвекавой дзейнасці Каталіцкага Касцёла на нашых землях і 35 гадоў аднаўлення структураў Рыма-Каталіцкага Касцёла ў Беларусі просім прабачэння за грахі і прысвячаем Божай Міласэрнасці Каталіцкі Касцёл у Беларусі, нашыя супольнасці, нашыя сем’і, дзяцей і моладзь, а таксама нашую Айчыну – Беларусь.

Мы верым у тое, што Ты, Божа, з прабачальнай любоўю сустрэнеш нас так, як міласэрны айцец сустрэў свайго марнатраўнага сына, і абяцаем як мага часцей звяртацца да суда Тваёй Міласэрнасці – да святой споведзі; акунацца ў Тваю Міласэрнасць, усклікаючы: «Езу, давяраю Табе!»; часцей прымаць святую Камунію, у якой утоеная Твая Міласэрнасць; чытаць Божае слова, у якім скрытая Твая спрадвечная мудрасць, і разважаць над ім; у штодзённым жыцці ахвотна здзяйсняць учынкі міласэрнасці для душы і цела кожнага чалавека.

Будзем жа маліцца *Вяночак да Божай Міласэрнасці* за саміх сябе і за тых, каму патрэбна дапамога, за наш Касцёл і за нашу Айчыну. Няхай пятнаццатая гадзіна кожнага дня стане гадзінаю Міласэрнасці для нас і для тых, каго мы будзем даручаць Божай Міласэрнасці, асабліва тых, хто набліжаецца да дому Нябеснага Айца.

Міласэрны Езу! Благаславі наш Касцёл, нашую мітраполію, біскупаў, прэзбітэраў, дыяканаў, кансэкраваных асобаў, свецкіх вернікаў і ўвесь наш народ. Тваёй Міласэрнасці мы давяраем лёс свету і лёс кожнага чалавека. Схіліся над намі, грэшнымі, вылечы нашую слабасць, знішчы ўсялякае зло, дазволь усім жыхарам зямлі спазнаць Тваю Міласэрнасць, каб у Табе, трыадзіны Божа, яны заўсёды знаходзілі крыніцу надзеі.

Сярод мноства небяспекаў і няпэўнасці заўтрашняга дня ўсклікаем да Цябе з бязмежным даверам: дапамажы нам перамагчы напады зла, якое ўкараняецца ў сэрцах сучасных людзей – зла, якое ў невымерных наступствах навісла над нашай сучаснасцю і, здаецца, перакрывае дарогі ў будучыню.

– Ад пажару, голаду, вайны і заразы – *выбаў нас, Пане!*

– Ад самазнішчэння, ад усіх войнаў – *выбаў нас, Пане!*

– Ад грахоў супраць чалавечага жыцця – *выбаў нас, Пане!*

– Ад нянавісці і прыніжэння годнасці дзяцей Божых – *выбаў нас, Пане!*

– Ад усялякай несправядлівасці ў грамадскім жыцці – *выбаў нас, Пане!*

– Ад невыканання Божых запаведзяў – *выбаў нас, Пане!*

– Ад спробаў знішчыць праўду пра Бога – *выбаў нас, Пане!*

– Ад грахоў супраць Духа Святога – *выбаў нас, Пане!*

Спрадвечны Ойча, дзеля балеснай мукі і ўваскрасення Твайго Сына, будзь міласэрны да нас і ўсяго свету! Божа наш! Верым у Цябе, праслаўляем Цябе, давяраем Табе і любім Цябе. Просім ў Цябе прабачэння для тых, хто не верыць у Цябе, не праслаўляе Цябе, не давярае Табе і не любіць Цябе.

Езу Хрыстэ, давяраемся Табе і спадзяемся на Тваю Міласэрнасць!

– Маці Божая міласэрнасці, – маліся за нас!

– Маці надзеі, – маліся за нас!

– Маці Божая Будслаўская, – маліся за нас!

– Каралева і Апякунка Беларусі, – маліся за нас!

– Святы Арханеле Міхале, апякуне Беларусі, – маліся за нас! Амэн.

**2 мая 2026 г.**

(З 1 мая пераносіцца пілігрымка рухаў)

*Адказныя: рэлігійныя рухі, с. Марцэліна Мігач (Шанштацкі рух), Людміла Платава (Рух факаляраў)*

Заклік: *Кроў Хрыста, моц веравызнаўцаў, — выбаў нас.*

Інтэнцыя: Аб благаслаўленні і развіцці для ўсіх касцёльных супольнасцяў, парафій, рэлігійных рухаў, каб іх дзейнасць і сведчанне паспрыялі навяртанню грэшнікаў, паглыбленню веры і любові ў нашай краіне.

Вялікім скарбам хрысціянства з'яўляюцца касцёльныя рухі і новыя супольнасці. Святы Ян Павел ІІ, які прысвяціў ім шмат увагі і пастырскай апекі, назваў рухі «адным з дароў Духа Святога ў наш час». У сваім Апостальскім лісце *«Novo Millennio Ineunte»* (На пачатку новага тысячагоддзя), што для еднасці Касцёла вельмі важна спрыяць «розным формам аб'яднанняў, як традыцыйных, так і больш новых, бо яны даюць Касцёлу жыццядайную сілу, якая з'яўляецца дарам Божым і праяўленнем сапраўднай “вясны Духа”. Безумоўна, неабходна, каб супольнасці і рухі дзейнічалі ў поўнай гармоніі з касцёльнай супольнасцю і аказвалі паслухмянасць аўтарытэтным указанням пастыраў» (n. 46).

Падобна тым пілігрымам, якія дзве тысячы гадоў таму хацелі ўбачыць Езуса, людзі нашага часу, хоць, магчыма, не заўсёды свядома, просяць сучасных хрысціянаў, каб яны не толькі «гаварылі» пра Хрыста, але ў пэўным сэнсе дазволілі ім «убачыць» Яго. […] Аднак нашае сведчанне было б недапушчальна ўбогім, калі б мы самі не былі першымі, хто сузірае аблічча Хрыста (NMI, 16).

(...) Нашы хрысціянскія супольнасці павінны станавіцца сапраўднымі «школамі» малітвы, у якіх сустрэча з Езусам — гэта не проста просьба аб Яго дапамозе, але праз удзячнасць, праслаўленне, адарацыю, кантэмпляцыю, слуханне і гарачую адданасць, мы павінны адчуць сапраўднае «захапленне» сэрца. Гэта павінна быць глыбокая малітва, якая, аднак, не павінна перашкаджаць нам удзельнічаць у зямных справах, бо, адкрываючы нашы сэрцы на Божую любоў, яна таксама адкрывае іх на любоў да нашых братоў і сясцёр і дае нам здольнасць фарміраваць гісторыю паводле Божага замыслу. (NMI, 33).

**Малітва перад Вяночкам**

Пане Езу, дзякуем Табе за рэлігійныя рухі, якія з’яўляюцца Тваім дарам для Касцёла. Просім Цябе, адары іх еднасцю, мудрасцю і дарамі Духа Святога. Няхай адважнае сведчанне іх веры прыцягвае іншых да Цябе, дай ім вытрываласць у цяжкасцях і выпрабаваннях, адары іх шчодрым плёнам у евангелізацыйнай дзейнасці. Няхай святы арханёл Міхал аберагае іх, каб яны ніколі не збочвалі са шляху Хрыста, а былі вернымі і мужнымі сведкамі Евангелля. Амэн.

**6 чэрвеня 2026 г.** – заканчэнне Навэнны

(З 1 чэрвеня пераносіцца пілігрымка ў Будслаў першакамунійных дзяцей)

*Адказныя: Салезіянская сям'я, Рэлігійная місія «Добрага Самараніна і св. Уршулі Ледухоўскай»*

Заклік: *Кроў Хрыста, якая ў Эўхарыстыі поіць і ачышчае душы, — выбаў нас.*

Інтэнцыя: Аб благаслаўленні дзяцей і моладзі, якіх мы аддаем Айцоўскай апецы ўсемагутнага Бога. Просім, каб яны пастаянна ўзрасталі ў Тваёй святой боязі, вялі праведнае хрысціянскае жыццё і ніколі не аддаляліся ад Цябе, будзь для іх дарогаю, праўдаю і жыццём дзеля Тваёй хвалы і радасці бацькоў.

«Незабыўнай сустрэчай з Панам Езусам, безумоўна, з'яўляецца Першая святая Камунія, — звяртаўся да дзяцей святы Ян Павел ІІ, — дзень, які ўспамінаецца як адзін з самых прыгожых у жыцці. Эўхарыстыя, устаноўленая Хрыстом напярэдадні Яго мукі, падчас Апошняй Вячэры, — гэта Сакрамэнт Новага Запавету, найвялікшы з сакрамэнтаў. У гэтым Сакрамэнце Пан Езус пад выглядам хлеба і віна становіцца пасілкам для нашых душ. Дзеці ўпершыню ўрачыста прымаюць гэты сакрамэнт — менавіта ў дзень Першай святой Камуніі, каб потым прымаць Яго як мага часцей і такім чынам заставацца ў цесным сяброўстве з Панам Езусам…. У святой Камуніі Хрыстус вядзе нас да любові Айца ў Духу Святым і дае нам удзел у жыцці Святой Тройцы, каб мы сталі «саўдзельнікамі Божай натуры» (2 П 1, 4), гэта значыць дзецьмі Божымі. (…) Аднак трэба памятаць, што менавіта катэхеза з’яўляецца выдатнай магчымасцю, каб дзеці і моладзь, глыбей пазнаючы праўды веры, маглі наблізіцца да жывога Езуса, прысутнага ў Эўхарыстыі. Без гэтага ўсведамлення не будзе саюзу любові, які павінна фармаваць вера» *(Jan Paweł II. Łodź, 1987 г.).*

Святы Ян Боска, выхавацель моладзі і дзяцей, настаўляў іх: «Паверце, мае маладыя людзі, што ёсць дзве наймацнейшыя апоры, якія падтрымліваюць вас да шляху да неба, — гэта сакрамэнты пакаяння і Эўхарыстыі. Лічыце вялікім ворагам вашай душы таго, хто спрабуе аддаліць вас ад гэтых дзвюх практыкаў нашай святой веры. Эўхарыстыя — гэта магутная зброя, якою можна перамагчы злога». Святы Ян Боска заахвочваў, каб дзеці навучыліся спавядацца і жыць заўсёды з Хрыстом Эўхарыстычным.

Мы ведаем шмат дзяцей і моладзі, якія з дзяцінства горача маліліся і праслаўлялі Бога, таму Каталіцкі Касцёл прызнаў іх святымі і благаслаўлёнымі. Нядаўна да ліку святых быў залічаны Карло Акуціс, падлетак, які вельмі

шанаваў Эўхарыстыю і Найсвяцейшы Сакрамэнт. Карло быў аўтарам вэб-сайтаў пра эўхарыстычныя цуды і пра каталіцкіх святых. Ён называў Эўхарыстыю «аўтастрадай да нябёсаў» і распаўсюджваў сваю любоў да Езуса Эўхарыстычнага на прасторах інтэрнэту. Ён з’яўляецца прыкладам для дзяцей і моладзі, як пры дапамозе сучасных сродкаў сувязі распаўсюджваць Евангелле Хрыста і адараваць Найсвяцейшы Сакрамэнт.

Просім яго заступніцтва за нашых дзяцей і моладзь.

*Божа наш Ойча, святы Карло Акуціс цэнтрам свайго жыцця ўчыніў Эўхарыстыю. Сваім штодзённым абавязкам гэты малады юнак лічыў праслаўленне Найсвяцейшага Сакрамэнту, у тым ліку сярод карыстальнікаў інтэрнэту, каб іншыя маглі любіць Цябе, Езу, больш за ўсё. Просім Цябе, наш Пан і Збаўца, умацуй нашую веру, ажыві надзею, аднаві любоў праз заступніцтва Карло Акуціса, які, узрастаючы ў гэтых цнотах, цяпер прабывае ў Тваёй прысутнасці. Амэн.*

**Малітва перад Вяночкам**

Езу, прысутны ў Найсвяцейшым Сакрамэнце, прагнем любіць Цябе больш за ўсё і заўсёды быць з Табою. Не дазваляй нам ніколі адысці ад Цябе. Будзь для нас дарогаю, праўдаю і жыццём. Езу, Боскі Збаўца, аддаем Табе нашы думкі, словы і ўчынкі. З любові да Цябе хочам зносіць усе непрыемнасці і цярпенні. Напоўні сабою наш розум, ачысці намеры, благаславі нашы малітвы, вучобу і працу, будзь з намі ў смутку і радасці. Няхай сэрца кожнага з нас заўсёды належыць Твайму Найсвяцейшаму Сэрцу. Амэн.

**4 ліпеня 2026 г. –** Нацыянальны санкруарый

Прысвячэнне Найдаражэйшай Крыві Пана нашага Езуса Хрыста.

Заклік: *Кроў Хрыста, усялякай хвалы і пашаны найдастойнейшая, — выбаў нас.*

Інтэнцыя: Удзячнасць за Найдаражэйшую Кроў Езуса — бясконцую крыніцу ласкаў, цану нашага адкуплення, Ахвяру збаўлення, складзеную на Крыжы за кожнага з нас і за ўвесь свет, а таксама за 35 гадоў аднаўлення структур Каталіцкага Касцёла ў Беларусі.